**Вучэбная дысцыпліна «Фарміраванне прафесійных кампетэнцый пры навучанні беларускай мове»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)<br>Кампанент установы вышэйшай адукацыі<br>Модуль дысцыплін "Прафесійна-метадычны" |
| **Кароткі змест** | Паняцці і катэгорыі дысцыпліны: мэта і змест моўнай адукацыі, працэс навучання мове, заканамернасці засваення мовы, развіццё маўлення. Сродкі навучання спецыяльным дысцыплінам. Прынцыпы навучання навыкам маўленчай дзейнасці. Паняцце метаду і прыёму навучання. Асновы класіфікацыі метадаў навучання. Планаванне вучэбнага матэрыялу. План і канспект урока. Віды вучэбных планаў. Мэта навучання маўленчай дзейнасці і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Значэнне, змест, задачы, прынцыпы вывучэння лексікі і фразеалогіі ў школе. Значэнне і задачы вывучэння граматыкі ў школе. Асноўныя пытанні методыкі развіцця маўлення вучняў. Віды творчай працы па развіцці маўлення. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:* тэарэтычныя асновы Канцэпцыі моўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і канцэпцыі вучэбнага прадмета "Беларуская мова"; сучасныя стратэгіі навучання спецыяльным дысцыплінам, падыходы да арганізацыі навучання, яго сучасныя тэхналогіі; прынцыпы адбору і структуравання вучэбнага матэрыялу, сродкі, метады і прыёмы навучання, формы і метады бягучага і выніковага кантролю; *умець:* аналізаваць сродкі навучання спецыяльным дысцыплінам; аналізаваць урокі; прадумваць метадычную структуру ўрока; папярэджваць памылкі і недахопы маўлення вучняў; прадумваць формы, метады і прыёмы бягучага і выніковага кантролю (праекціровачныя ўменні); распрацоўваць канспекты ўрокаў беларускай мовы; адбіраць у адпаведнасці з мэтамі ўрока вучэбны матэрыял, метады, прыёмы; выконваць навукова-метадычную работу, удзельнічаць у працы навукова-метадычных аб'яднанняў; аналізаваць уласную дзейнасць з мэтай яе ўдасканалення і павышэння сваёй кваліфікацыі.<br>СК-24 Аналізаваць эфектыўнасць інавацыйных сродкаў, метадаў і формаў навучання беларускай мове на фоне традыцыйных методык<br>СК-25 Рэалізоўваць у выкладчыцкай дзейнасці сучасныя методыкі навучання правільнасці маўлення |
| **Прэрэквізіты** | "Педагогика". |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 120 акадэмічных гадзін, з іх 68 аўдыторных: 34 г лекцый і 34 г практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 4-й семестр, тэсціраванне, экзамен |